# ПРАГРАМАВАННЕ КАЛЬКУЛЯТАРА З УБУДАВАНЫМІ ГАЛАСАВЫМІ ФУНКЦЫЯМІ

**Дзенісюк Д. А., Марчык М. У., Крывальцэвіч А. В., Казлоўская Н. Д.**

*Аб'яднаны інстытут праблем інфарматыкі НАН Беларусі, Мінск, Беларусь,*
*marynamarczyk@gmail.com*

На працягу доўгага часу каманда лабараторыі распазнавання і сінтэзу маўлення АІПІ НАН Беларусі працавала над стварэннем і паляпшэннем алгарытмаў сінтэзу маўлення. Атрыманыя вынікі было вырашана ўвасобіць таксама і ў калькулятары з галасавымі функцыямі

Калькулятар створаны на мабільнай платформе Android і на дадзены момант мае магчымасць агучкі ўсіх уведзеных лічбаў, абраных аперацый і выніку праведзеных падлікаў. Прадстаўлены алгарытм дазваляе вывесці на экран і агучыць вынік не толькі як набор лічбаў, але і ў форме дапасаваных у родзе, ліку і склоне лічэбнікаў на беларускай, рускай і англійскай мовах (малюнак 1).




*Мал. 1. Галоўны экран, функцыі і вывад вынікаў*
*у праграме «Гаворачы калькулятар»*

Дадзеная мабільная праграма знаходзіцца ў вольным доступе для бескаштоўнага спампавання з Google Play [1] і можа выкарыстоўвацца як навучальны сродак для вывучэння як асобных лікаў, так і правільнага напісання і гучання лічэбнікаў на розных мовах.

### Літаратура

1. Google Play – Гаворачы калькулятар [Электронны рэсурс]. – Мінск, 2018. – Рэжым доступу: https://play.google.com/store/apps/details?id= by.ssrlab.ssrlab_calc&hl=be. – Дата доступу: 20.03.2018.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm